**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**Зацвярджаю**

**Загадчык кафедры культуралогіі**

**____________ А.І. Смолік**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
па дысцыпліне

# “МЕТАДАЛОГІЯ І МЕТОДЫКА НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ ”

**Складальнік: Праф. Ігнатовіч П.Р.**

**Вучэбна-метадычны комплекс зацверджаны на пасяджэнні кафедры культуралогіі 25.09.2012 года, пр.№1**

**2012**

**Тлумачальная запіска**

Прыярытэтнымі напрамкамі развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі з’яўляюцца яе гуманітарызацыя, пад’ём агульнай культуры будучых спецыялістаў. Выхаванне культурай – гэта ўзнаўленне памяці духоўных вытокаў, фарміраванне нацыянальнага светапогляду. Ва ўмовах духоўнага, маральна-этычнага, экалагічнага крызісу асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне студэнтамі вышэйшых навучальных устаноў культуралогіі – адной з базавых дысцыплін у сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі.

Веданне тэорыі і гісторыі культуры дазваляе далучыцца да духоўнага вопыту старэйшых пакаленняў, стварае патэнцыяльныя магчымасці для ўсебакавога развіцця асобы і фарміравання агульначалавечых ідэалаў. Праз культуру можна далучыць маладых людзей да аксіялагічнага боку быцця. Важнейшую рысу культуры – яе пераемнасць – можна рэалізаваць толькі сістэматызаваным, лагічна пабудаваным вучэбным працэсам. Самастойна авалодаць скарбамі сусветнай культуры, нягледзячы на ўсе сучасныя тэхналогіі, немагчыма. Акрамя таго, сёння ні адна з’ява, што мае дачыненне да гуманітарнай сферы, не можа быць разгледжана без культуралагічнага кантэксту; без яго любы дыскурс ужо будзе няпоўным.

Праграма разлічана для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў і ўлічвае папярэдне атрыманыя веды па гуманітарных дысцыплінах (гісторыі Беларусі, эканамічнай тэорыі, філасофіі, паліталогіі, педагогіцы, асновах ідэалогіі Беларускай дзяржавы), веданне ў цэлым асаблівасцей культурных эпох і атрыманне пэўных звестак па розных відах мастацтва.

У праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па айчыннай гісторыі, беларускай і сусветнай літаратуры, этнаграфіі, мастацкай культуры, філасофіі, фалькларыстыцы і некаторых іншых дысцыплінах.

Праграма арыентавана на пошук гібкіх сувязей паміж гуманітарнымі і ўласна культуралагічнымі праблемамі. Прычым мастацкая культура разглядаецца як індыкатар стану ўсёй культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма прадугледжвае сістэматызаванае вывучэнне тэарэтыка-практычнага матэрыялу, неабходнага менавіта студэнтам для лепшага засваення імі асноўных дысцыплін спецыялізацыі.

*Мэта дысцыпліны:*

– паглыбенне сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі культуры;
– раскрыццё сутнасці культуралагічных метадаў і спосабаў пазнання і тлумачэнне разнастайных працэсаў і з'яў культуры;
– асэнсаванне законаў развіцця культуры;
– фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, які грунтуецца на метадалогіі і методыцы навуковых даследаванняў у сацыякультурнай сферы.

*Важнейшымі задачамі дысцыпліны з'яўляюцца:*

– выяўленне анталагічных і гнасеалагічных сэнсаў культуры;
– вызначэнне месца і ролі культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы грамадскага развіцця;
– асэнсаванне заканамернасцей і механізмаў функцыянавання і развіцця культуры як атрыбута сацыяльай сістэмы;
– выяўленне працэсуальных элементаў даследавання феноменаў культуры;
– паказ асноўных узроўняў навуковых даследаванняў у сферы культуры.

*У выніку засваення вучэбнага курса "Метадалогія і методыка навуковых даследаванняў у сферы культуры" студэнты павінны ведаць:*

– ключавыя метадалагічныя пазіцыі, прынцыпы і метады культуралогіі, якія забяспечваюць разуменне культуры як інтэгратыўнай сістэмы;
– сацыялагагічны інструментарый даследавання ў сферы культуры;
– асноўныя кірункі даследавання ў галіне культуры;
– тэарэтычны і імперычны ўзроўні пазнання зместу культуры;
– прынцыпы, метады, спосабы і прыёмы дасягнення сутнасці даследуемага аб'екта і прадмета культуры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– магчымасці гуманітарнай навукі як формы пазнання феноменаў культуры;
– асноўныя мэты, задачы, сродкі навуковага даследавання культуры;
– праграмы навуковых даследаванняў у сферы культуры;
– асноўныя метады культуралагічных даследаванняў;
– асноўныя формы фіксацыі вынікаў даследавання культурных працэсаў.

*Студэнты павінны ўмець:*

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;
– назапашваць тэарэтычны і эмпірычны матэрыял для выяўлення сутнасці
  і зместу культурных працэсаў;
– выкарыстоўваць метады культуралагічных даследаванняў;
– планаваць і ажыццяўляць навуковую дзейнасць у галіне культуры;
– вызначаць праблему, аб’ект і прадмет даследавання ў сацыякультурнай сферы;
– фармуляваць навуковую гіпотэзу як галоўны метадалагічны інструмент;
– апрацоўваць, аналізаваць і абагульняць навуковую інфармацыю;
– укараняць вынікі навуковых даследаванняў у сферу культуры.

*Метады (тэхналогіі) навучання*

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);
– метад аналізу канкрэтных сітуацый;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэматычны план

| №<br>п/п | Назва тэмы | Лекцыі | Семінары | Самастойная работа |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Прадмет і задачы курса | 2 | 2 | |
| 2. | Сфера культуры як аб'ект навуковага даследвання | 2 | 2 | 2 |
| 3. | Навука і стварэнне новых ведаў | 2 | | |
| 4. | Асноўныя віды і этапы навуковых даследванняў | 2 | 2 | |
| 5. | Праграма навуковых даследванняў у галіне культуры | 2 | 4 | 2 |
| 6. | Навуковая гіпотэза | 2 | 2 | 2 |
| 7. | Метады збора інфармацыі | 2 | 4 | |
| 8. | Аператыўныя сацыялагічныя даследванні | 2 | 2 | |
| 9. | Апрацоўка, аналіз абагульненне навуковай інфармацыі | 2 | 2 | . ' , |
| 10. | Вынікі даследвання. Падрыхтоўка і здача справаздачы | 2 | 2 | 2 |
| | **Усяго: 26** | **20** | **22** | **8** |

Усяго-50 лекцый- 20

Форма кантролю - залік семннараў-22

сам. работы - 8

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны. Прадмет “Метадалогія і методыка навуковых даследаванняў у сферы культуры”, спецыфіка і задачы

Пазнанне – гэта працэс мэтанакіраванага адлюстравання рэчаіснасці ў свядомасці з мэтай яе далейшага магчымага змянення. Галоўным вынікам пазнавальнай дзейнасці з’яўляецца адэкватнае адлюстраванне аб’екта суб’ектам.

Эмпірычны ўзровень пазнання прадугледжвае назапашванне пэўнай сумы ведаў. Тэарэтычны, абапіраючыся на практыку, выходзіць за межы вопыту, інтэгруючы гэтыя веды ў выглядзе тэорый. Узаемасувязь і несупярэчлівасць ведаў забяспечваюць цэласнае ўспрыманне культурнага досведу.

Сучасная навука як важнейшая форма рацыянальнага засваення рэчаіснасці ўяўляе сабой разгалінаваную сістэму ведаў. Кожная з яе галін выкарыстоўвае тую або іншую сукупнасць метадаў і спосабаў пазнання і тлумачэння рэчаіснасці. У сувязі з гэтым метадалогія навукі з’яўляецца вельмі складанай і многаўзроўневай. Пры гэтым пад метадалогіяй разумеецца сістэма прынцыпаў, метадаў, спосабаў і прыёмаў дасягнення ісціны. У структуры метадалогіі навукі важнае месца займае метадалогія культуралогіі.

Метадалогія культуралогіі ўяўляе сабой вучэнне аб прынцыпах пабудовы, формах, метадах і спосабах пазнання культуры. Яна вызначаецца ўласцівасцямі яе прадмета. Вынікі даследавання культуры залежаць ад выяўлення яе прызначэння, законаў яе развіцця, адносін да грамадскага жыцця, яе месца сярод разнастайных з’яў і працэсаў.

### *Тэма 1.* Сфера культуры як аб’ект навуковых даследаванняў

Культура як сістэма, што самаразвіваецца. Анталагічны і гнасеалагічны сэнс культуры. Культурная разнастайнасць і неабходнасць яе даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заканамернасці і механізмы функцыянавання і развіцця культуры як атрыбута сацыяльнай сістэмы. Раскрыццё унутраных сэнсаў артэфактаў культуры, вобразаў, формы і сэнсаў, якія ўтрымліваюцца ў іх, задача навукі аб культуры.

*Тэма 2.* **Навука як важнейшая форма пазнання ў сучасным свеце**

Спецыфіка пазнавальных адносін чалавека да свету. Навуковае і пазанавуковае пазнанне. Формы рэфлексіўнага асэнсавання навуковага пазнання. Навука ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця. Метадалагічныя і сацыякультурныя перадумовы станаўлення сучаснай навукі. Феномен навукі ў сучасным грамадстве. Феномен квазінавукі. Праблемнае поле культуралогіі: фундаментальныя і прыкладныя культуралагічныя даследаванні.

Каштоўнасны статус навукі ў сучаснай культуры. Сацыяльныя каштоўнасці і нормы навуковага этасу. Творчая свабода, сацыяльная адказнасць у сучаснай навуцы.

*Тэма 3.* **Асноўныя ўзроўні навуковых даследаванняў у культуры**

Навуковае даследаванне як форма арганізацыі пазнавальнай дзейнасці. Сістэма прадпасылачных ведаў. Няяўныя веды. Тэарэтычны і эмпірычны ўзроўні навуковага даследавання. Стылі навуковага мыслення.

Праблема і пытанне ў структуры навуковага даследавання. Аб’ект даследавання як фрагмент культурнага працэсу ці з’явы культуры. Прадмет даследавання як сукупнасць устойлівых, узаемазвязаных характарыстык аб’екта.

Мэты, задачы і ўмовы навуковага даследавання. Сродкі даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4.* **Праграма навуковага даследавання ў сферы культуры**

Аб’ектыўная абумоўленасць распрацоўкі праграмы даследавання. Месца і роля праграмы ў навуковым даследаванні. Праграма як тэарэтычная мадэль даследавання, асноўных яе метадалагічных прынцыпаў, методык і працэдур.

Структура праграмы. Тэарэтычна-метадалагічны і практычна-метадычныя раздзелы. Метадалагічны раздзел: фармулёўка праблемы, мэты і задачы даследавання; вызначэнне аб’екта і прадмета даследавання; распрацоўка рабочых гіпотэз.

Працэдурна-метадычны раздзел: выбар і абвастрэнне метадаў збору інфармацыі; вызначэнне выбарачнай сукупнасці (выбаркі); распрацоўка інструментарыя даследавання; распрацоўка арганізацыйна-тэхнічных працэдур (тэрміны, графікі і інш.).

### *Тэма 5.* **Метады культуралагічных даследаванняў**

Метад (ад грэч. methodos – шлях даследавання ці пазнання) – сукупнасць правіл, прыёмаў і аперацый практычнага або тэарэтычнага асваення рэчаіснасці.

Метад як сукупнасць прадпісанняў, якія рэгламентуюць змест і паслядоўнасць пазнавальных дзеянняў, аперацый і працэдур даследавання.

Класіфікацыя навуковых метадаў: непасрэдныя і апасродкаваныя; якасныя і колькасныя; апісальныя і тлумачальныя; змястоўныя і фармальныя.

Агульналагічныя метады: параўнанне, аналіз, сінтэз, абстрагаванне, індукцыя, дэдукцыя, аналогія, мадэліраванне.

Метады эмпірычнага даследавання: назіранне, апісанне, вымярэнне, аналіз дакументаў, апытанне, эксперымент.

Метады тэарэтычнага даследавання: мысленны эксперымент; ідэалізацыя; фармалізацыя; аксіяматычны метад, гіпатэтыка-дэдуктыўны метад, пераход ад абстратнага да канкрэтнага, метад адзінства культурна-гістарычнага і лагічнага.

Метады культуралагічнага аналізу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 6.* **Працэсуальныя элементы навуковага даследавання**

Выбар тэмы і фармулёўка праблемы даследавання. Тэарэтычная, практычная і метадалагічная актуальнасць выбару тэмы.

Вызначэнне мэты і задач даследавання і іх дэталізацыя.

Выбар аб'екта і прадмета даследавання. Рэпрэзентатыўнасць, надзейнасць, дакладнасць даследавання.

Ідэя ў навуковым даследаванні.

Выбар (пабудова) метадаў даследавання. Паслядоўнасць выкарыстання метадаў.

Назапашванне новай інфармацыі і канцэптуалізацыя ведў. Паняційная ідэнтыфікацыя навуковай інфармацыі. Сістэматызацыя інфармацыі.

*Тэма 7.* **Навуковая гіпотэза**

Гіпотэза – галоўны метадалагічны інструмент, які арганізуе ўвесь працэс даследавання і падпарадкоўвае яго строгай логіцы.

Гіпотэза як навуковае меркаванне. Папярэднія веды і новыя факты – аснова гіпотэзы. Вылучэнне гіпотэзы на першапачаковым этапе даследавання. Агульныя патрабаванні да абгрунтавання гіпотэзы. Гіпотэзы павінны быць дакладнымі, канкрэтнымі, простымі, яснымі, прынцыпова правяраемымі, тычыцца толькі прадмета даследавання, не павінны быць трывіяльнымі, зводзіцца да відавочных меркаванняў на ўзроўні цвярозага розуму. Рабочая гіпотэза. Функцыі гіпотэзы: канцэптуалізацыі, тлумачэння, прадказання.

*Тэма 8.* **Кірункі навуковых даследаванняў у галіне культуры**

Сістэматызацыя культурных з'яў па сутнасных прыметах. Фенаменалагічнае апісанне культурных аб'ектаў і іх класіфікацыя па знешніх атрыбутыўных прыметах. Эмпірыка-сістэматызатарскія даследаванні культурных феноменаў мінулага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванне культуры ментальнасцей, культуры штодзённасці, гістарычнай дынамікі культуры і яе формаў.

Праблема дзейнасці і адаптыўна-тэхналагічныя функцыі культуры.

Сацыякультурная мадэрнізацыя і гістарычная дынаміка беларускай культуры.

Культурная палітыка і дзейнасць культурных інстытутаў ў Беларусі. Сацыякультурнае прагназіраванне, праектаванне і рэгуляванне. Сацыялізацыя і інкультурцыя асобы. Ахова культурнай спадчыны беларусаў.

Аналіз зместу, структуры, дынамікі і тэхналогій функцыянавання сацыякультурнага вопыту ў ракурсе яго генезісу, селекцыі і акумуляцыі, сістэмнай упарадкаванасці, рэгулятыўнай практыкі, зменлівасці, семантычнай выражнасці і практыкі засваення.

*Тэма 9.* **Сацыялагічны інструментарый даследавання ў сферы культуры**

Сутнасць і паняцце сацыялагічных метадаў даследаванняў. Метады збору інфармацыі: назіранне, апытанне, аналіз дакументаў, эксперымент і інш. Метады апрацоўкі і аналізу даных: фактарны, латэнтна-структурны, карэляцыйны, рэгрэсіўны, дысперсійны аналіз, ранжыраванне, шкаліраванне, індэксаванне і інш. Метады пабудовы тэорыі: дэдуктыўны, індуктыўны, параўнальны, прычынны, структурна-функцыянальны, генетычны, ідэаграфічны і інш.

*Тэма 10.* **Апрацоўка, аналіз і абагульненне навуковай інфармацыі**

Характарыстыка метадаў аналізу і апрацоўкі інфармацыі. Паняцце "першасная інфармацыя". Метады другаснай апрацоўкі інфармацыі (метады графічнай падачы даных). Універсальныя метады аналізу і апрацоўкі навуковай інфармацыі (аналіз сацыяметрычных данных, або кантэнт-аналіз тэкстаў). Праблема дакладнасці дакументальнай інфармацыі. Правілы пазбягання "пастак сенсацыйнасці" і павышэння дакладнасці навуковай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыі. Паняцце рэпрэзентатыўнасці, структурныя элементы і іх узаемасувязь у кантэксце апрацоўкі і аналізу навуковай інфармацыі.

*Тэма 11.* **Вынікі даследавання і формы іх фіксацыі**

Вынікі даследавання як элемент навуковага аналізу з’яў і феноменаў культуры. Формы фіксацыі вынікаў: новыя навуковыя факты, колькасная залежнасць паміж з’явамі, паняцці, катэгорыі, навуковая карціна даследуемай рэчаіснасці, навуковая тэорыя.

Карэляцыя вынікаў з характарам вырашаемай праблемы, мэтамі, задачамі даследавання.

Плануемы і пабочны вынік даследавання. Адлюстраванне новага ўзроўню вывучанасці аб’екта, больш поўнага асэнсавання шляхоў і метадаў пазнання, асаблівасцей сістэмнай арганізацыі ведаў у культуралогіі. Формы справаздачы аб выніках даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Тэматыка
# практыгчных (семінарскіх) заняткаў
## па курсу "Метадалогія і методыка сацыялагічнага даследавання ў сферы культуры"

Тэма 1. Уводзіны. Прадмет і задачы курса План семінара 1. Паняцце і сутнасць дысцыпліны
2 Паняцце і сутнасць катэгорыі «метадалогія».
3. Тэарэтычны і эмпірычны ўзровень пазнання працэсаў і з'яў культуры. Навуковае даследаванне. Яго спецыфіка
4. Сутнасць і змест катэгорыі «методыка»

Тэма 2. Сфера культуры як аб'ект навуковых даследаванняў План семінара
1. Этымалогія і генезіс паняцця культуры
2. Культура як самаразвіваючася сістэма
3. Сацыяльныя функцыі культуры
4. Падыходы да аналіза культуры

Тэма 3. Навука як важнейшая форма пазнання ў сучасным свеце План семінара
1. Паняццце навукі. Навука як дзейнасць і сістэма ведаў
2. Формы рэфлексіўнага асэнсавання авуковага пазнання
3. Спецыфіка навуковага пазнання. Навуковы і ненавуковыя (ненаучные) веды
4. Прабемнае поле кулыуралогіі: фкндаментальныя і прыкладныя культуралагічныя даследаванні

Тэма 4. Асноўныя ўзроўні навуковых даследаванняў у культуры План семінара
1. Навуковае даследаванне як фома арганізацыі пазнавальнай дзейнасці
2. Тэарэтычны і эмпірычны ўзроўні навуковага даследавання
3. Мэты, задачы і ўмовы даследавання. Сродкі даследавання.

Тэма 5. Праграма навуковага даследавання ў сферы куьтуры План семінара
1. Месца і роля праграмы ў навуковым даследаванні
2. Задачы і фенкцыі праграмы
3. Структура праграмы: тэарэтыка-метадалагічны раздзел, працэдурна-метадычны раздзел

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэматыка дакладаў і рэфератаў

**"Метадалогія і методыка навуковых даследванняў у сферы культуры"**

1. Пазнавальныя дзеянні і формы іх арганізацыі.
2. Сутнасць катэгоры "Метадалогія".
3. Сутнасць і значэнні паняцця "Методыка".
4. Метад як рэгулятыўны сродак і форма рэфлексіі над пазнавальнымі дзеяннямі ў навуцы.
5. Паняцце навуковага (сацыялагічнага) даследвання.
6. Віды навуковых даследванняў.
7. Асноўныя этапы арганізацыі і правядзення навуковых (сацыялагічных) даследванняў.
8. Сфера культуры як аб'ект навуковага даследавання.
9. Класіфікацыя навуковых

метадаў.

Ю.Агульналагічныя метады.

11 .Метады тэарэтычнага даследавання.

12.Метады эмпірычнага даследавання.

І3.Метады збору навуковай (сацыялагічнай інфармацыі).

14.Праграма навуковага (сацыялагічнага даследавання).

15.Логіка навуковага даследавання.

Іб.Спецыфіка аб'екта і прадмета даследавання.

17.Пастаноўка праблемы, вызначэнне аб'екта і прадмета даследавання.

18.Навуковая гіпотэза.

19.Метады збора сацыялагічнай інфармацыі.

20.Сплашныя і выбарачныя даследаванні.

21 .Метад назірання.

22. Аналіз дакументаў - важны метад навуковага пазнання.

23.Апытанне: паняцце, віды, формы правядзення.

24.Навуковы (сацыялагічны) эксперымент.

25.Апрацоўка, аналіз і абагульненне навуковай інфармацыі.

26.Правядзенне вынікаў даследавання.

27.Падрыхтоўка і здача справаздачы аб выніках даследвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

### Асноўная літаратура


1. *Антология*: новая постиндустриальная волна на Западе. – М.: Academia, 1999. – 640 с .
2. *Берков, В.Ф.* Философия и методология науки. / В.Ф. Берков. – М.: ООО «Новое знание», 2004. – 336 с.
3. *Берков, В.Ф.* Логика: учеб.пособие для студентов гуманит. фак. вузов / В.Ф.Берков [и др.]. – Минск: Вышэйш. шк., 1994. – 296 с.
4. *Гуревич, П.С.* Культурология / П.С. Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.
5. *Динамика* научного знания и гуманитарные параметры современной науки: метод.разраб.и рекомендации к спецкурсам по философии и методологии науки для студентов филос.-экон.фак. / БГУ им. В.И. Ленина; авт.-сост.: Я.С. Яскевич, А.В. Барковская. – Минск, 1994. – 46 с.
6. *Ерасов, Б.С.* Социальная культурология / Б.С. Ерасов. – М.: Аспект-пресс, 1998. – 591 с.
7. *Лапина, С.В.* Социологическое познание: Методологические проблемы исследования социальных явлений и процессов: учеб. пособие. / С.В. Лапина. – Минск: Бел. Навука. 1998. – 207 с.
8. *Игнатович, П.Г.* Этнические основания культуры / П.Г. Игнатович, Ю. В. Чернявская. – Мн.: Технопринт, 2001. – 100 с.
9. *Иконникова, С.Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С.Н. Иконникова. – СПб.: Санкт-Петербург. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.
10. *Ионин, Л.Г.* Социология культуры: путь в новое тысячелетие / Л.Г. Ионин. – М.: Логос. – 439 с.
11. *Кармин, А.С.* Культурология / А. С. Кармин. – СПб.: Питер, 2001. – 464 с.
12. *Лосев, А.Ф.* Диалектика мифа / А. Ф. Лосев. – М.: Мысль, 2001. – 560 с.
13. *Лукашевич, В.К.* Научный метод: структура, обоснование, развитие. Минск: 1991. – 206 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14.*Лукашевич, В.К.* Анатомия научного метода. / В.К. Лукашевич. – Минск: «Мисанта». 1999 – 96 с.

15.*Лотман, Ю.М.* Семиосфера / Ю. М. Лотман. – СПб.: Искусство, 2000. – 704 с.

16.*Маркарян, Э.С.* Теория культуры и современная наука / Э.С. Маркарян. – М.: Мысль, 1983. – 284 с.

17.*Смолік, А.І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапаможнік / А.І. Смолік, Л.К. Кухто. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 281 с.

18.*Флиер, А.* Культурология для культурологов / А.Флиер. – М.: Академический проект, 2000. – 492 с.

**Дадатковая літаратура**

1. *Бердяев, Н.* Судьба России / Н. Бердяев. – М: МГУ, 2001. – 256 с.
2. *Гуссерль, Э.* Кризис европейского человечества и философия / Э. Гуссерль // Культурология. XX век: антология. – М.: Юрист, 1995. – С. 297 – 330.
3. *Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.
4. *Почепцов, Г.Г.* Теория коммуникаций / Г.Г. Почепцов. – М.: Релф-бук, 2001. – 656 с.
5. *Сартр, Ж.П.* Экзистенциализм – это гуманизм / Ж.П. Сартр // Сумерки богов. – М., 1989. – С. 91–104.
6. *Тейяр де Шарден, П.* Феномен человека / П. Тейяр де Шарден. – М.: Наука, 1987. – 240 с.
7. *Тойнби, А.Дж.* Постижение истории / А.Дж. Тойнби. – М.: Прогресс, 1991. – 640 с.
8. *Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М.: РОССПЭН, 2004. – 960 с.
9. *Франкл, В.* Человек в поисках смысла / В. Франкл. – М.: Прогресс, 1990. –368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Фуко, М.* Слова и вещи: археология гуманитарных наук / М. Фуко. – СПб.: A-cad, 1994. – 408 с.
11. *Хайдеггер, М.* Время и бытие / М. Хайдеггер. – М.: Республика, 1993. – 447 с.
12. *Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М.: Канон, 1994. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пытанні да заліку

**"Метадалогія і методыка навуковых даследванняў у сферы культуры"**

1. Прадмет, задачы і функцыі курса "Метадалогія і методыка навуковых даследванняў у сферы культуры".
2. Сутнасць катэгорыі "метадалогія".
3. Сутнасць і значэнне паняцця "методыка".
4. Вызначэнне навуковага даследавання.
5. Віды навукоавых даследаванняў.
6. Асноўныя этапы арганізацыі і правядзення навуковых (сацыялагічных) даследаванняў.
7. Праграма сацыялагічнага даследавання: агульная характарыстыка, структура.
8. Праблема, аб'ект, прадмет, мэта і задачы навуковага даследавання.
9. Патрабаванні да распрацоўкі і фармуліравання гіпотэз.
10. Працэдурны раздзел праграмы даследавання.

11 .Сутнасць выбарачнага метада. Рэпрэзентатыўнасць. Генеральная і выбарчая
савакупнасць.

12. Паняцце
метада.

ІЗ.Метады тэарэтычнага даследавання.

14. Метады эмпірычнага даследавання.

15.Метады збора навуковай інфармацыі.

16.Назіранне як спосаб атрымання навуковай (сацыялагічнай) інфармацыі.

17. Дакумент як крыніца навуковай (сацыялагічнай) інфармацыі. Віды дакументаў. Правілы работы з дакументальнымі крыніцамі.
18. Апытанне: паняцце, віды, формы правядзення.
19. Анкетаванне і інтэрв'юіраванне.
20. Эксперымент як метад у навуковым даследаванні.
21. Апрацоўка, аналіз і абагульненне навуковай інфармацыі.
22. Падрыхтоўка і здача справаздачы аб выніках даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ